# «РУЖАНСКАЯ БРАМА» ЗНОЎ СКЛІКАЕ ГАСЦЕЙ




**Сёння ў Ружанах праходзіць пяты па ліку фестываль у гонар галоўнай мясцовай славутасці. Правядзенне маштабнага свята стала магчымым пасля рэстаўрацыі часткі велічнага палаца роду Сапегаў, які яшчэ ў даўнія часы заслужана параўноўвалі з Версалем.**

## ЗАНЯПАД І АДРАДЖЭННЕ

Варта нагадаць, што Сапегі мелі на тэрыторыі сучаснай Беларусі паўтара дзясятка маёнткаў. Але Ружанскі палац стаў галоўнай рэзідэнцыяй магутнага роду. Канцлер Вялікага Княства Літоўскага, складальнік Статута ВКЛ Леў Сапега ўзвёў велічны замак-палац. Тут быў славуты на ўсю Еўропу тэатр, не менш вядомая бібліятэка. У розны час Ружаны ўганаравалі візітам каралі Рэчы Паспалітай Жыгімонт І, Уладзіслаў IV, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

Спачатку двухпавярховы будынак рэзідэнцыі, узведзены на мяжы XVI—XVII стагоддзяў, быў замкам, які меў тры вежы. І толькі ў другой палове XVIII стагоддзя, пасля амаль поўнага разбурэння, аднойлены замакператварыўся ў раскошны палац. Рэзідэнцыя, акрамя іншага, славілася сваімі шматʼяруснымі падваламі, у якіх захоўваліся розныя каштоўнасці: ад казны і зброі да калекцыі рэдкіх він. З веку ў век у розных крыніцах перадаецца легенда пра падземны ход, які вядзе да Касаўскага палаца, што знаходзіцца на адлегласці ў 25 кіламетраў.

На працягу ўсёй гісторыі велічная ружанская рэзідэнцыя цярпела ад войнаў і набегаў. Замку даставалася ад канфліктаў мясцовай шляхты ды Паўночнай вайны. А пачаткам занападу палаца стала паўстанне 1831 года, пасля якога ўладанні канфіскавала царская ўлада і ў былых княжацкіх пакоях запрацавала ткацкая фабрыка. Першая сусветная вайна прынесла пэўную разруху ў маёнтак. Ну, а Другая сусветная прывяла да знішчэння палацава-паркавага ансамбля роду Сапегаў.

Адразу пасля вайны на тэрыторыі палаца яшчэ некаторы час працавалі розныя прадпрыемствы, ва ўсходнім флігелі, напрыклад, была кантора калгаса. А потым людзі пакінулі векавыя муры. Астаткі былой велічы актыўна ішлі мясцовым жыхарам на будматэрыялы. Ахвотныя


Фота Валерыя КАРАЛЯ.

разбіралі цэглу, камень — што каму трэба было. І вось да пачатку 2000-х на тэрыторыі, куды простаму чалавеку некалі быў уваход забаронены, спакойна пасвіліся козы ды рос бурʼян.

У 2008-м пачаліся работы па аднаўленні. І паступова літаральна на вачах уздымалася ўязная брама з бакавымі флігелямі і варотамі. У адным з флігеляў адкрыўся музей.

## ГАЛОЎНЫ ЭКСПАНАТ

Першы фестываль «Ружанская брама» правялі ў 2011 годзе, калі была гатовая брама і толькі адзін флігель. Тады ўжо сабраліся тысячы людзей, у той год і было вырашана прадоўжыць фестывальную традыцыю. А яшчэ першы фэст адназначна ўвайшоў у гісторыю дзякуючы адной знамянальнай падзеі: на ім правялі прэзентацыю віртуальнай бібліятэкі Сапегаў. Гэтая бібліятэка колькасцю ў 4,5 тысячы асобнікаў была, несумненна, галоўным інтэлектуальным і духоўным складнікам палаца. Бо якімі б шыкоўнымі ні былі маёнткі, галоўнае, які дух у іх лунаў, якімі каштоўнасцямі кіраваліся гаспадары, як выхоўвалі сваіх дзяцей...

Пры падтрымцы бюро ЮНЕСКА ў Маскве група навукоўцаў рэалізавала праект «Віртуальная рэканструкцыя бібліятэкі роду Сапегаў». Цяпер дастаткова ўключыць дыск і можна чытаць копіі кніг, якія знаходзяцца ў Вільнюсе, Санкт-Пецярбургу, Варшаве, іншых гарадах. Названы дыск стаў адным са знакавых экспанатаў музея.

За апошнія пяць гадоў паявіліся іншыя экспанаты, якімі ганарацца супрацоўнікі. Напрыклад, бронзавая пячатка роду Сапегаў з выявай герба «Ліс» у абрамленні ружаў і ўпрыгожаная сімваламі вайсковай доблесці. Цяпер ідзе рэстаўрацыя ўсходняга корпуса.

Так што ў Ружанах ёсць што паказаць гасцям і падчас свята, і ў будныя дні. Пасля першага прайшло яшчэ тры фестывалі. Потым здарыўся двухгадовы перапынак з прычыны недахопу фінансавання. І вось добрая навіна: фэст аднаўляе работу. Апошняму паспрыяў грант ад Еўрасаюза, які пасялковы Савет выйграў на развіццё турызму.

## ШТРЫХІ ДА ПРАГРАМЫ

Гэтым разам фестываль атрымлівае статус міжнароднага. Арганізатары чакаюць гасцей з блізкага і далёкага замежжа.

— Найлепшыя калектывы аматарскай творчасці Брэстчыны прыедуць на свята, — расказала **намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пружанскага райвыканкама Таццяна ЯРОШКА.** Напярэдадні ў Пружанах прайшоў фінал абласнога конкурсу «З любоўю да песні», а на фестывалі адбудзецца гала-канцэрт яго найлепшых удзельнікаў. Публіка пазнаёміцца з творчасцю расійскага фолк-гурта «Партызан FM». Тэатралізаваная праграма пачнецца гістарычнай пастаноўкай, плануецца выступленне ансамбля «Крэсіва». Брэсцкіх артыстаў зменіць сталічны гурт «Без білета». Заключным акордам свята стане шоу агню і лазера, неба над палацавым комплексам асвецяць феерверкі.

У «Горадзе майстроў» будзе працаваць больш за сотню ўмельцаў з Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. «Фішкай» свята абяцае стаць дух Сярэднявечча, які ўзяліся стварыць гістарычныя клубы. Яны падрыхтавалі майстар-класы па танцах Сярэдніх вякоў, рыцарскі турнір, спаборніцтвы па кіданні тапароў, лучны цір. Вядома ж, у гэты дзень гасцей запросяць паглядзець экспазіцыю музея «Ружанскі палацавы комплекс роду Сапегаў». З ранку да вечара будзе працаваць выязны гандаль. «І гэта толькі невялікія штрыхі да насычанай разнастайнай праграмы свята», — падкрэсліла Таццяна Іванаўна.

Паводле яе слоў, галоўнае, што фестываль чакалі мясцовыя жыхары. Ружанцы вельмі ганарацца сваім палацам, сваёй гісторыяй. Ведаюць і з задавальненнем дзеляцца з прыезджымі легендамі, паданнямі пра славутасць. У пасёлку яшчэ жывуць людзі, якія хадзілі на працу ў калгасную кантору, што размяшчалася ў адным з флігеляў былога палаца. Іншыя шмат чаго памятаюць з расказаў сваіх бацькоў і дзядоў. І вось гэты фестываль для іх як сведчанне таго, што пра Ружаны ведаюць не толькі на мясцечковым узроўні, але і ў краіне, і нават за яе межамі. Таму на фэст абавязкова прыязджаюць дзеці, унукі цяперашніх жыхароў пасёлка. Сустрэчы з роднымі дадаюць сямейнага каларыту ў культурна-масавае мерапрыемства. А пасля свята прыезджыя сваякі і проста госці раскажуць сябрам і знаёмым, напішуць у сваіх пастах у сацыяльных сетках пра ўражанні. І гэта цудоўная магчымасць прывабіць яшчэ больш турыстаў у старажытныя Ружаны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
yackevich@zviazda.by

■ Вернісаж

# ХХ стагоддзе праз экспрэсію, мару і авангард

## Карціны славутага італьянскага футурыста спалучылі з палотнамі беларускіх мастакоў-наватараў

**У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі адкрылася выстаўка «Даторы, Шагал, Суцін, Хадасевіч-Лежэ. Энергія, экспрэсія, сімволіка і сны. Погляд на мастацтва Італіі і Беларусі першай паловы ХХ стагоддзя». Сёлета беларусы ўпершыню сустрэнуць палотны перуджынскага мастака-футурыста Джэрарда Даторы. Нягледзячы на тое, што да нас прыехалі толькі 14 карцін, выбраныя работы ахопліваюць амаль усе перыяды творчасці мастака і дакладна дэманструюць этапы яго станаўлення.**


Надзея ХАДАСЕВІЧ-ЛЕЖЭ «Супрэматызм. Кампазіцыя з чырвоных, чорных і шэрых геаметрычных фігур», канец 1960-х — пачатак 1970-х.

Фота Марыі ВОЙЦІК.

— Выстаўка — гэта частка вялікай культурнай праграмы пасольства Італіі ў Мінску, прымеркаванай да 25-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж нашымі краінамі і Года італьянскай культуры ў Беларусі, — расказаў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Італіі ў Беларусі Стэфана БʼЯНКІ** падчас прэс-канферэнцыі. — Беларусы добра знаёмы з італьянскай культурай, бо Італію і Беларусь абʼядноўвае даўняе супрацоўніцтва. Мы хацелі адкрыць беларусам нешта новае пра сваю краіну, таму абралі для выстаўкі ў Мінску менавіта асобу Джэрарда Даторы.

Экспазіцыя «Даторы, Шагал, Суцін, Хадасевіч-Лежэ. Энергія, экспрэсія, сімволіка і сны. Погляд на мастацтва Італіі і Беларусі першай паловы ХХ стагоддзя» вылучаецца інфармацыйнай насычанасцю. Італьянскі бок вельмі адказна падышоў да арганізацыі выстаўкі. Дзякуючы працы арганізатараў наведвальнікі, не знаёмыя з мастацтвам Джэрарда Даторы, могуць даведацца пра яго творчасць і жыццё. Акрамя аўтарскага жывапісу, у Мінск прыехалі архіўныя дакументы і фільм, прысвечаны вядомаму ўраджэнцу Перуджы. Адзін з дакументаў «Архіва Даторы» найбольш цікавы для беларусаў, бо сведчыць пра тое, што справа Джэрарда Даторы мела прыхільнікаў нават на савецкай прасторы. Пад шклом захоўваецца ліст, праз які


Джэрарда ДАТОРЫ «Умбрыйскае возера», 1942.

Асацыяцыя незалежных украінскіх мастакоў 25 лютага 1932 года запрашала Даторы стаць сурэдактарам іх часопіса «Мастацтва».

Як слушна заўважыў адзін з арганізатараў выстаўкі Аляксандр Зіменка, мастакі, прадстаўленыя ў Нацыянальным музеі, не здолелі б самастойна дамовіцца пра агульную экспазіцыю: апантаныя творчымі задумамі, яны не паступіліся б сваімі ідэямі дзеля агульнай карціны. Такім, як гэтыя мастакі, — супярэчлівым, праваацыяльным і ў той жа час поўным на таленты — паўстала на выстаўцы ХХ стагоддзе. Летуценныя «Заказаныя» і «Гадзіннік на палаючым небе» Марка Шагала, экспрэсіўныя «Вялікія лугі ў Шартры каля віядука» і «Ева» Хаіма Суціна, авангардныя графічныя работы Надзеі Хадасевіч-Лежэ спалучыліся з карцінамі Джэрарда Даторы, прывезенымі з Калекцыі муніцыпалітэта горада Перуджы (музей-палац Палаца дэла Пэна).

Выбраныя для экспазіцыі карціны дэманструюць эвалюцыю жывапісу Джэрарда Даторы. Пра вопыт працы дэкаратарам нагадвае невялікая «Дэкарацыя», намаляваная алоўкам ды акварэллю. Вынік захаплення ідэямі дывізіянізму ўвасабляе «Умбрыйская дзяўчына», якая вылучаецца сярод іншых карцін не толькі асаблівым падыходам да перадачы колеру, уласцівым дывізіяністам, але і выключным духоўным зместам. Нягледзячы на тое, што назву «Выбух» мае толькі адна карціна, астатнія таксама можна апісаць гэтым словам: выбух фарбаў, летуценняў, пачуццяў. Футурыстычныя палотны мастака надзвычай дынамічныя; кампазіцыя будуецца так, быццам усе абʼекты на палатне імкнуцца ўверх, у неабсяжную прастору нябёсаў. Натуральна, што Даторы прывабіў кірунак аэражывапісу: пейзажы, убачаныя з борта самалёта, складаюць большасць прывезеных з Італіі арт-абʼектаў. Усе перыяды творчасці мастака абʼядноўвае асаблівая рытмічнасць, якая вызначае яго аўтарскі почырк.

Убачыць авангардыстаў ХХ стагоддзя на ўласныя вочы можна будзе ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі да 6 ліпеня.

**Дарʼя ЧАРНЯЎСКАЯ**
■